Уладзімір Мароз

# Шляхцянка-восень

*Лірыка любові й кахання*



Уладзімір Мароз

# Шляхцянка-восень

## Лірыка любові й кахання

Мінск
Выдавец
Зміцер Колас
2010

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
М28

Мастак Марына Мароз

**Мароз**, У. В.
М28 Шляхцянка-восень : лирыка любові й кахання / Уладзімір Мароз. — Мінск : Зміцер Колас, 2012.— 140 с.
ISBN 978-985-6992-13-4

Спрадвечная тэма кахання ў кнізе Уладзіміра Мароза ёсць адбіткам уласнага жыцця, сагрэтага цеплынёю любові. Вершы зборніка прасякнуты верай у перамогу дабра над злом, вылучаюцца шчырасцю інтанацыі, пачуццёвай безабароннасцю, светлай лірычнасцю.

Адрасуецца шырокай чытацкай аўдыторыі.

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5

**ISBN 978-985-6992-13-4**

© Мароз У. В., 2012.
© Мароз М. У., ілюстрацыі, 2012.
© Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2012.

# ВОЛЬЗЕ

*Няўзнак выракаемся слоў,*
*Яны тут, бадай, недарэчы.*
*З табою каханкі ізноў,*
*Нявольнікі першай сустрэчы.*

*Як быццам гадоў не сплыло –*
*Ізноўку наш месяц мядовы.*
*Пяшчоты пякучай крыло*
*Жадана кранула нанова.*

*Збавенне турботаў усіх,*
*Збавенне ад цэлага свету, –*
*Спатольна ляцім удваіх*
*У нетры спякотнага лета.*

*Жыві, узвышайся, красуй,*
*Кахання прыгожая сіла!*
*Магутна раскінь свае крылы,*
*Усіх, хто бяздольны, ратуй!*



# ШЛЯХ ЛЮБОВІ

## КРЭДА

Няможна спаць,
хвілінай адцурацца
Жыцця свайго,
сумненняў і згрызот,
Бо можа стаць,
бо можа проста стацца,
Што згінеш сам,
пазбегнуўшы турбот.

Нашто тады гарэў агонь спякотна,
Нашто кахаў і верыў, чыстым быў?
Спатольна даць,
даць проста, незваротна
Усім цяпло,
каго калісь любіў…

## ДРУГОГА НЕ ДАДЗЕНА

На пагорак ускіне дарога –
І з царквою ў паднеб’е ляціш.
Нам не дадзена нават другога,
Шлях любові – адзіны ў жыцці.

З тым ідзі на прастор сіняплынны,
Да радзіннага дому свайго,
Дзе салодкі плыве дым Айчыны –
Анікому не выдзьмуць яго.

І таму супакой невымерны
На сямі еўрапейскіх вятрах.
Мітусіцца бязладна няверны,
«Быць - не быць» – яго кідае ў жах.

Нас такія сумненні мінаюць,
У суладдзі душу беражы.
На расстайных сцяжынах трымаюць
Знакі Божай любові – крыжы.

# ТРЫПЦІХ ЛЮБОВІ

**1**

Што далей? – А далей тое ж самае:
Не жадай, не ўкрадзі, не забі.
Бо галовамі столі дасталі мы,
А не меней сцякае крыві.

Акрываўлены душы і целы,
Падсякаюцца спрэс карані.
Не паверу, што ладу паменела,
Збракавала няўзнак дабрыні.

Не такое трывалі нашэсце,
Але ўсё ж не згарэлі ў агні.
Пойдзем шляхам любові нарэшце –
І ніяк па-другому, ані.

**2**

І ніяк па-другому не быць:
Ціха выйсці ў зіхоткае ранне,
Аб змаганні надоўга забыць –
Валадарыць сягоння каханне.

Ды пяшчотныя рысы зямлі –
Мройны вобраз жаночага цела.
У каханне кідай камяні –
А яно, ты глядзі, ацалела.

І адпрэчвае цемру святло,
Спеляць ласку і рукі, і грудзі,
Абвівае любові вязьмо…
Самі будзем злачынцы і суддзі.

## 3

Што далей? – А далей тое ж самае:
Ты і край, дзе наш рупіцца лёс.
А галоўнае, пэўна, чым сталі мы,
Што ў душы ад радзімы прынёс.

Тут і клятвы даваць непатрэбна –
Проста светла, сумленна пражыць.
І не думаць, што тайны ўсе зведаў,
І што ведаеш слова «любіць».

Што далей? – Зразумела, работа.
Чысты аркуш алоўкам крані,
Каб азваўся ў душы гэты дотык,
І ніяк па-другому, ані.

# ПАПЯРОВЫЯ ГАРАДЫ

*Архітэктарам-горадабудаўнікам*

Папяровыя гарады,
папяровыя гарады,
Гарады маіх мар
і надзей маладых.
Я па вуліцах крочу,
дзе сонца заўжды,
Дзе ніколі-ніколі
не будзе бяды.
Дзе ў вялікай пашане
сама прыгажосць
І зямля, чалавеку патрэбная, ёсць.

Папяровыя гарады,
папяровыя гарады,
Пра вас можна бясконца сябрам гаварыць.
Там усё як звычайна –
і ночка, і дзень,
Але там неспадзеў ты насустрач ідзеш.
Ты, якую даўно,
праз гады я шукаў,
Дзе, напэўна, жывеш –
гарадамі блукаў.
Па няроўнай дарозе нялёгка ішоў –
Толькі ў горадзе мары нарэшце знайшоў.

Папяровыя гарады,
папяровыя гарады, –
Хто чакае і верыць – прыходзьце сюды.

Гарады дабрыні,
дзе спаўненне ўсяго,
Гарады маіх сноў
і кахання майго.
Я па вуліцах крочу,
дзе сонца заўжды;
Толькі крыху шкада –
тут не ходзяць дажджы…

## ВЕТРЫК АРЭЛЯЎ

Казку летняга дня не прымроіла, не –
Лёгкі ветрык арэляў схапіў нечакана.
Штось на вуха пяшчотна нашэптваў ён мне,
Называў непаўторнай, адзінай, абранай.

Спакушаў ён на ўзлёце цнатліва зграшыць,
Зблытаў думкі і сам заблудзіўся ў спадніцы.
Аддалася яму без ваганняў душы,
Каб дастаць асалоды з гаючай крыніцы.

Сум нязбыўны растаў, бы пад сонцам туман,
Спаталенне жадання прымружыла вочы.
Мрояў дзіўных спрадвечны салодкі падман,
Лёгкі ветрык арэляў, спакуснік жаночы…

## ЖАНОЧЫ РАНАК

Брыду немаркотны – ні радасці і ні адчаю,
Лагоднага ранку ціхмяна-дапытлівы госць.
Як еўнух стары на жанчын маладых паглядаю,
Пажады ні знаку, хвалюе адно прыгажосць.

Яно і не дзіўна – наўкола жаночае племя,
Пастаці прывабніц кранаюць сваёй пекнатой.
Ідуць у світанне, мужчынскім налітыя семем,
З адбіткам на твары таемнасці ночы густой.

Мужчыне каханаму кожная з іх прыналежыць –
Шануй, уладар, і не збіся, крый Божа, на здзек.
Пазвоньвае ціха гадзіннік на ратушнай вежы,
Жаночы нядоўгі нястрымана мерае век.

Суцішся, няспынны, адужаць нікому не ў стане
Жаноцкасці квецень, світанак ёй альбу пяе.
Надзеяй збавення насустрач вяслуе каханне,
Пунсовая ружа раскрые пялёсткі свае.

## ПАРАТУНАК

Знікла ўсё пра каханне – ні вершаў цяпер і ні песняў,
Не шукайце ў раманах, зусім у кіно не відаць.
Мо само ўжо прапала?
Згібела па градах і весях,
Толькі позірк дакорны застаўся, што цяжка трываць.

І пад гэтым паглядам няўтульна табе і няёмка,
Быццам маеш віну за распусту, нявер’е, падман.
Дык збірацца ў дарогу! –
З табой адыходзім на золку
У вандроўку-падмогу, якой нават назвы няма.

Мы гукаем з сабою насупраць бяздушным завеям,
І мелодыя кліча – любові праніклівы гук.
Удваіх вось яшчэ там ідуць…
Не згасае надзея,
Падтрымаюць каханне суткі паглядаў і рук.

# ЖАНР

Віно каля вострава «ню»,
Дзе мора лагодна шапоча,
Балбоча аб волі жаночай,
Якая крычыць: паланю.

І позірк спаткнецца штораз
Аб спелыя пругкія грудзі.
Ды неяк нядоўга пабудзе,
Бо келіх адцягне якраз.

«Мадэрца» лагодна цячэ,
І формы зусім не кранаюць.
Другія няхай тут канаюць,
Спакуса калі апячэ.

Якія жаданні – тавар!
На продаж таемныя рысы.
Плаці, пачуццём калі высах,
За гэтакі сонечны дар.

На вернасць крушэнне надзей,
Каханне з адданасцю – дзе вы?
Навокал адны толькі Евы,
І гэтулькі мала дзяцей.

# ПАМКНЕННЕ

Буйнацелая, юная, вабная,
Ты праносіш вярэдліва стан.
Шчэ хвіліна – і ўкінуся ў багну я,
Дзе наскрозь забыццё і туман.

Дзе гушкаюць спакусы арэлі,
Чэрці песцяць распусты пажар.
Да мяне тут другія згарэлі,
Акунуўшыся ў пошасці вар.

Дзе твой гонар, мацнейшая частка? –
Калатнеча і ноччу, і днём.
Самі пнёмся ў раскрытую пастку,
На салодкія ўзвышшы імкнём.

Пачакай, прыгажуня пажадная,
Цёмны покліч схавай у вачах.
Лепш змайструю я вершыкі складныя,
Адкуплюся на праведны шлях.

* * *

Пякучае жаданне стаць жанчынай
У постаці дзяўчыны маладой.
Гатова несці галаву з павіннай
За непапраўнасць ночы, ды не той.

Давай, прыходзь пад вечар, пагаворым –
Спакуснік звадліва прашэпча ёй.
Свет памуціўся ўвесь, такога гора –
Расстацца з гэтай самай чысцінёй.

Яе ў жыцці не стрэнеш на дасвецці,
Няма ў раманах нават і ў кіно.
З душою чыстаю паплача вецер
Аб тым, што незваротнае даўно.

Спяшаюцца – чаго, каб папытаўся?
Зірнуць глыбей нікому і няўзнак.
Цвяроза голас ціхі аказаўся:
Чаго няма – не з’явіцца ніяк.

## ПАСЛЯ

Дзе вянок дзявочы мой? –
Не падняць.
Любы, ты дарма не стой
Давідна.

Прачакаў, надзеяй жыў –
Не счакаў.
Што не меў і не здабыў –
То аддаў.

Адабрала ўсё мана –
Як забыць?
Шчасця й радасці да дна
Мне не піць.

Гэтак з сорамам і жыць,
Плач не плач.
Цэлы век сябе журыць…
Ты прабач.

# ВЫБАР

Мы дапішам апошнія вершы,
Больш паперы не будзем купляць.
Хто апошні там быў, а хто першы –
Нам на гэта цяпер напляваць.

Аддамося прадажнаму веку,
Ухапіць каб свой ломаны грош.
Як усе, так і сам стань калекам,
За другіх будзь не лепш і не горш.

Тытунёвы смурод рэстаранны,
Блудны водар парфумы чужой.
Баль апошні, разгульны, адчайны,
Жоўты д’ябал кіруе табой.

Дык хапайма, пакуль не забралі,
Тую рыжую ў ложак цягні!
Людзі ў прыцемках спрэс заблукалі,
Не баяцца згарэць у агні…

Усё ж не п’ецца ў ахвоту, не есца,
Чорны сум на вяселлі чужым.
Ім пахмелле – нам лобныя месцы,
Дзе аддана чакаюць крыжы.

## НАКЦЮРН

Дзень пражыты. У ноч
Паімчыцца таксі.
Павязе не мяне, не мяне паімкне, –
Мы-то разам даўно.
Выбіваецца з сіл,
Але згаснуць не хоча агонь у акне.

Патухае ў адным,
Ды гарыць у другім –
Знак нястомнай жывой чалавечай душы.
Хто шукае, для тых
Горад паліць агні –
Мне цяпельцы малыя ўсю ноч варушыць.

Гэта значыць – ляцець,
Каб людзей зnітаваць, –
Ліхтары ля дарогі са мной заадно.
Я сустрэчы вязу,
Гэта значыць – не спаць
У надзеі, што ўдзячна патухне акно.

# ЗНАК

Пяшчоты хваля будзённасць змые –
Гадзінай боскай адны ў сусвеце.
І срэбны крыжык на белай шыі
Паўцемру раптам няўзнак асвеціць.

Няхай не вераць зладзеі ў Бога –
Іх час таксама начной парою.
Але не ўкрадуць цяпер нічога,
Бо Ён за міласць стаіць гарою.

Святой часінай любоў ратуе,
Дарогай простай падкажа выйсце.
Ад злога свету нас крыж вартуе –
Няхай так будзе, пакуль ісці нам.

# ГРАФІКА ВОСЕНІ

Памыць акно – і графіку галін
Праявіць шкло яскрава, урачыста.
Пакратаць клічуць гронкі арабін,
Так вабяць хораша – у восень выйсці.

І ты выходзіш, волат-уладар,
Ідуць агледзіны сваёй работы:
Надзеі горада ці апраўдаў
І як здаволіў на графічнасць попыт?

Бы з вокан пыл, журбу з галінак змыў,
Туман прагнаў яшчэ ўчарашнім ранкам.
І сум таксама – быў ён ці не быў?
Ты да мяне сыходзіш лёгка з ганка.

Гушкае восень нашых крокаў ціш,
Кладуцца паркі, вуліцы пад ногі.
На святлафоры звычна паглядзіш –
Ад іх няма цяпер перасцярогі.

Здаецца, сёння ясна бачна ўсё,
Далей, бліжэй, і што было, што будзе.
Давай цішэй празрыстасць панясём,
Каб неспадзеўкі той настрой не спудзіць…

Але прыгледзься ўсё ж – адценні ёсць,
І на пытанні ўперадзе адказы.
Празрыстасць восеннню – не часты госць,
Сама графічнага прадвесце часу.
Зімы.

* * *

Восень адлятае – не злавіць,
Струнамі адвечнымі звініць.
Быццам ты яе не зразумеў,
Быццам мог сказаць – і не паспеў.

Пра хвалістасць спелых нашых ніў
І магутны Нёмана разліў.
Пра бацькоў, братоў і пра людзей –
Толькі б не сфальшывіць анідзе.

І што ты прыйшла ўжо да мяне,
І што сёння хмара абміне…
Не журы сябе, што не паспеў,
Хай вярэдзіць восеньскі напеў.

Вечны неспакой славянскі,
Той,
Што завуць акрэслена – душой,
Дзе заўсёды пачуццё віны
І трывогі – не было б вайны.

## ШЛЯХЦЯНКА-ВОСЕНЬ

Санет

Шляхцянка-восень, я з табой блукаю
Па мяккіх сцежках страчанага раю.
Шляхі заслала згубленай лістотай,
Пякуча вабіш неспазнанай цнотай.

Брыду з табой. Агорнуты пяшчотай,
Пачуюся абранаю істотай.
Мне аднаму сягоння фарбы краю –
Малюнкаў восеньскіх альбом гартаю.

Шпацыр вядзе нас ціха паміж дрэў –
Дастаць спакою я даўно хацеў,
Калі з сабою кліча неба просінь.

Агонь жаданняў-дум не дагарэў,
Вярэдзіць тайнай горні песняспеў –
Не пакідай мяне, шляхцянка-восень.



# ПЕРШАПУТАК

# ВЕРШ ПРА ДАЎГІ

Як даўгі аддаваць, то вяртацца,
А вяртацца ў былое – вітацца.
Добры дзень! – дзе чакаюць вяртання.
Абыякава так: прывітанне…

Прывітанне, ці ўсё ж добры дзень?
У пакутах: ідзеш – не ідзеш.
І ці можа вяртацца каханне?
І навошта яно, развітанне?

У каго запытацца? –
                    не ведаю.
У бабуль, што стаяць ціха з кветкамі?
У даўгах, у каханні, расстанні
Разабрацца
            згубіў спадзяванні.

Лепш за ўсё перакур – вось запалка,
Без развагаў шчымлівых запарка.
Час падзеліць найлепей, як трэба,
Каму хлеба,
            каму і да хлеба…

* * *

З табой няпроста, цяжка без цябе –
Не зразумець мне дзіўнае праявы.
Не побач ты – работа не ідзе,
Ды і забавы проста не забавы.

Знікаюць фарбы ўсе, не спыніш дні,
Няўважлівы, разбіты, сарамлівы.
Здаецца, гэтым не жывеш адным,
А зніклі ўсе прылівы – спрэс адлівы.

Чарсцвееш сэрцам да людскіх турбот,
І да сябе, схаваўся, не падлезці, –
Вярэдны стан як той высокі плот,
Цераз які не можаш пералезці.

Сустрэчы нашы быццам напавер
Бяром ў ашчаднай касе маладосці.
Хоць суцяшэннем – ты са мной цяпер,
Але ўсё роўна замінае штосьці.

І нат ў абдымках дзе той супакой?
Душы пасаг – нязробленыя справы.
Пара кахання сталася цяжкой;
Не зразумець мне гэткае праявы.

## НЯПЭЎНАСЦЬ

Зноў туман, цыгарэты сырыя,
Непатрэбныя словы ізноў.
Мы з табою ідзём, маладыя,
Першапуткам, без пэўных шляхоў.

Ці акрэсліцца прышласць нарэшце?
Ці світальную песню спяе?
Крыж царкоўны ў тумане прадвесцем –
Блаславенне ці смутак дае?

Ды рака без адзінага броду,
Нават словы прапалі зусім…
І ліхтар, перакулены сподак,
Перапынак на ноч папрасіў.

## ВЕРШ З ЭПІГРАФАМ

*Ні цішыні, ні цеплыні і ні пяшчоты,*
*І проста звычка пакідаць усё на потым –*
*А тут зіма*
*настойліва*
*грукоча ў дзверы:*
*Пакінь,*
*пакінь зусім ў каханне й шчасце верыць…*

Згадкай гарачага поўдня
Слодыч жаночага цела.
Келіх вялікі, як поўня,
Выпіць спатольна карцела.

Водарам бабіна лета
Наша з табою пяшчота.
Мякка шапоча пра гэта
Лісце апалае ўпотай.

Згукам зляцелай сняжынкі
Ціш паслявосеньскай ночы.
Водзяць кахання сцяжынкі,
Любасць глядзіць вочы ў вочы.

Сходы ўздымаюць на ганак,
Душам ад еднасці светла.
Пругкі пярэдадзень-ранак
Вольна ўзыходзіць над светам.

# ЗІМОВАЕ СПАТКАННЕ

Прыснілася, бяжым мы
Па лесвіцы наверх…
Прымроіў капяжыны,
А тут пад стрэху снег.

Пяшчота дзівы дзее,
Пераступі парог.
Павер, і адагрэю
З мароза ўсіх дарог.

Агонь схаваўся ў печы,
Нас распаліўшы, знік.
Аголеныя плечы,
Зачаравання міг.

Ці сон, ці ява гэта –
Не зразумець ніяк.
Агеньчык цыгарэты,
Даверлівасці знак.

Чакаю, дачакацца б
Жаданай прастаты.
Пяшчотны дотык пальцаў…
Як проста – гэта ты.

## ЗІМОВАЕ РАЗВІТАННЕ

Цяжарны месяц, белая дарога,
Куток, якіх на Беларусі многа:
Цямнее лес, і вёска побач ёсць.
Ты тут жывеш, а я сягоння госць.

Дарма што шлях – такая ціш, ні згуку.
Ты ад марозу ўсё хаваеш рукі.
Мы тут адны, нялёгкі пошук слоў,
Мяне праводзіш – развітанне зноў.

Яно надзейна адабрала словы,
Цябе ў хусцінцы пазнаю нанова.
– Ат, белы колер, ён да твару ўсім…
Ізноў маўчым. Не згодзен я зусім:

Ты для мяне адна. Наўсцяж прыволле,
І лес адзін, заснежанае поле.
А слоў няма, маўчым і я, і ты,
Як быццам явай свята нематы…

З-пад лесу раптам выплыве машына –
Хутчэй, хутчэй, нясцерпныя хвіліны!
– Так, толькі я. Паехалі, браток…
На Беларусі ёсць адзін куток.

# ВЕРШЫ ПРА КАХАННЕ

Чытаеце вершы,
пяшчотныя вершы:
Адценняў не трэба, галоўнае – верыш.
Галоўнае – верыш,
галоўнае – верыць,
Тады дачакаеш:
пагрукае ў дзверы.

Адценняў не трэба – яны для кахання.
Самотнае сёння з былым развітанне.
Хацелася – побач,
хацелася – разам,
Але вы не верыце
ў чыстыя сказы.

Не верыце проста,
зняверыцца проста,
Да звад чалавечых трымаючы доступ.
Душу прыхавалі
ў прыгожыя словы –
Далёка той шлях,
дзе ўсё будзе нанова.

Чытаеце ціха
шчымлівыя вершы.
Хацелася б верыць – даказвай, што верыш:
У наша каханне
і ў наша спатканне,
У нашу вясну,
трапяткое світанне…

# МАЛАДЫ НАЧНЫ ВЕРШ

Знічка тухне недапалкам у вадзе,
Ціха, мякка ноч па Нёману брыдзе.
Дно ні вокам, ні рукою не дастаць,
Абняліся лодкі з берагам ды спяць.

Спачываць пайшоў даўно спякотны дзень,
Ціха месяц клічу я – са мной хадзем.
Сядзем разам, маладосці справім баль,
Потым к зоркам уцячэш сваім, на жаль.

Ды, напэўна, светламу нядрэнна там –
Сядзь і думай пра каханне, братка, сам.
А каб марылася збыўна і лягчэй,
Ты цыгарку прыпалі, дымні яшчэ.

Што тут думай, што не думай –
Будзем жыць,
І ці варта ў свае годы варажыць?
Разнасцежаныя дзверы – дзе ж ты, госць?
Я чакаю, аркуш чысты ў мяне ёсць.

Дзе запішам мы з табой шчаслівы лёс,
Так салодка едзе ноччу мрояў воз…
Думка мякка цішынёй святой брыдзе –
Згаслі знічкі ўсе, згубіліся ў вадзе.

# ПАЯДНАННЕ

Я спазняюся, яна чакае,
Вось хвіліна – час імчыць шпарчэй.
Потым скажаш, што ўсяляк бывае,
Што спяшаўся і ляцеў хутчэй.

Не патрэбны гэткія расказы –
Проста рада, што прыйшоў, прыйшоў.
Даць спакой нарэшце, калі разам,
Каб каханай не чакаць ізноў.

Побач быць і агарнуць пяшчотай,
Адагрэць маленькі наш пакой.
Берагчы ад бездаражы, слоты,
Захаваць душы яе спакой…

Я спазняюся к сваёй каханай,
Незваротна час далей бяжыць…
Мы загоім развітанняў раны,
У былым пакінем. Будзем жыць.

## НЕЧАКАНЫ МАТЫЎ

У слухаўцы – о цуда! – тэлефоннай
Спявалі аб вакзалах і расстанні.
Спакойна, у суладдзі з ноччу соннай,
Таварыш спаў у душнай пачакальні.

Я так не змог у горадзе нязвыклым,
У горадзе чужых бяроз і клёнаў.
Кахання сум мяне з вакзала выкраў –
Іду ў абдымкі цьмянага перона.

І тут знайшоў той таксафон шчаслівы,
Дзе сувязь дазваляла перабоі,
Дзе не гудкі, а песня – проста дзіва! –
Стаяў і слухаў, гаварыў з табою.

Хаця званіць не мелася патрэбы,
Бо ты мяне ўсё роўна не чакала…
Спакойна рэйкі адлівалі срэбрам,
І песня раптам назусім прапала.

Святлом ліхтарным бралася світанне,
Чаканне шляху халадзіла плечы.
Далося цяжка наша развітанне –
Я марыў пра спатольныя сустрэчы.

## ЧАКАННЕ СВЯТЛА

Не еду дадому,
Не слухаю ціш
І вершаў не буду пісаць,
Пакуль ты ні слова, пакуль ты маўчыш,
Надзеі не хочаш падаць.

Бывае іначай –
Шчымлівы адчай
Пральецца ў выслоўі-радкі.
А мой не пазначыць
Нязведаны край,
Паэзіяй лічым які.

Калі зразумееш
Мяне і сябе –
Ушыр разрасцецца пратал.
Надзею пасееш –
Збавенне праб’е,
Праявяцца словы святла.

## У ТЭАТРЫ

Дзе люд размаіты ў партэры,
Спаткнешся раптоўна вачыма:
Жанчына, чужая жанчына…
Разладзіцца час адпачынку,
Адчыняцца памяці дзверы.

За імі пяшчоты ўспаміны
Ды безабаронныя ночы.
Паўцемрай хаваюцца вочы,
І грудзі да ласкі ахвочыя…
Цяпер жа…
І хто ў тым павінен?

Навошта настрой сапсаваны,
Ісці і вітацца – як справы?
Кранаць чысціню для забавы?
Сустрэч нечаканых праявы –
Туга, незагойныя раны.

Сплылі незваротна сустрэчы,
Не вернуцца болей ніколі.
Душа захлынецца ад болю,
Сам-насам з «салодкаю» воляй
Ізноў адзіноты йдзе вечар.

## НЯВАРТАЯ ВОЛЯ

Пах перастоелых кветак,
З белай сурвэткаю стол.
Вокны ў фіранкі адзетыя,
Бледнага колеру столь.

Крок адвітальна-спакойны,
Шчоўкнуў на ростань замок.
Як меркаваў быць прыстойным,
Так быў і рады, што змог.

Вольным хацелася птахам,
Свежага водару ўдых.
Вабілі новыя пахі –
Час паімчаўся наўзвіх.

Іншыя кветкі ляцелі,
Сталі жанчыны маной.
Волі нявартай арэлі
Гушкалі сум мой са мной.

Вось бы вярнуцца – бо зведаў
Той адзінотнасці страх.
Пах перастоелых кветак,
Горкай шчымлівасці пах.

## ЧАС ПІК

Час пік, да запатрабавання,
Сустрэчаў час і час расстанняў.
Мільённы коціцца натоўп,
Штосілы рупіць крыкнуць: стоп!
Суцішце бег, машыны, людзі,
Знямогся я ў нясцерпным гудзе.
Стаміўся ўжо адзін ісці –
Патрэбна мне цябе знайсці.
Куды вы, вуліцы, прапалі,
Каханне дзе маё схавалі?
Аўтобус, ты яе павёз?
Падсушыць вецер кроплі слёз.
Самотай вуліцы засланы,
Даўно ўжо ліст мой адасланы.
Выразна мроіцца не раз,
Што ўжо прыйшоў спаткання час.
Спадзеў дарма – чужыя твары,
Вядуць без выйсця тратуары,
Б'юць незваротнасцю гадзін.
Хто дапаможа? – Я адзін?

Самотны стан выпрабавання –
Час пік, да запатрабавання.
Вядомы шлях, якім ісці:
Цябе павінен я знайсці.

* * *

Да цябе
Святлафоры закрылі шляхі –
Неспадзеўкі знікае надзея.
Час, як золата, зараз такі дарагі,
Ды марудна штось цягнецца дзея.

Скрыжаванні трымаюць: навошта, куды?
Перакрылі машыны дарогу.
Прапусціце, а то недалеч да бяды,
Зразумейце тугу і трывогу!

Горад, сёння цябе я зусім не люблю,
Ты ляжыш на душы вострым камнем.
Адпусці хоць у снах на той востраў-зямлю,
Дзе пануе пяшчота, каханне…

Вось нарэшце: ліхтарныя вочы начэй,
Скрыжаванні струменяць зялёным.
Не спыняе ніхто – дык штосілы, хутчэй!
Прага шчырасці, будзь спаталёнай!

# КАНЕЦ СТУДЭНЦТВА

Куды табе на вёсцы марнавацца?
Але ўцякаеш.
А маглі ўдваіх
У родным горадзе з табой застацца…
Сядзім, і незваротнасць б’е пад дых.

У скверыку няўтульным каля плошчы,
Дзе падбіраюць пляшкі ад віна,
Цябе я адгаворваў і адпрошваў,
Цябе маліў –
З цямна і да відна.

Прызнання слоў маіх, напэўна, мала,
Не чуеш іх, а мо гучаць маной.
Яшчэ не верыла і не кахала,
Казала так:
Пара пабыць адной.

Што ж, пабыла –
І знікла як удача.
Адзін на плошчы,
А маглі ўдваіх.
Уважліва прыгледзься – і ўбачыш:
Стаў шэрым горад без вачэй тваіх.



# ПЯШЧОТНЫ ВЫРАЙ

## ПАСЛЯВЯСЕЛЬНАЕ

Па-людску было ўсё, як трэба:
Жадалі як жыць, што рабіць.
Цяпер удваіх нам ляпіць
Свой гмах аж да самага неба.

Каханне – надзейны падмурак,
Цярплівасць – цаглінкі ў сцяну.
Каб шлях родаводны цягнуць,
Надзейны патрэбны прытулак.

Памкненні любоў акрыліла,
Узнесла завостраны дах.
І бусел – жаданы тут птах…
Адужаць ці хопіць нам сілы?

* * *

Дотык пальцаў тваіх
На маёй на шчацэ –
То пяшчотнасці ўздых.
Я ж удзячны руцэ,
Што даскажа без слоў
Пра каханне тваё.
Адзіноту – далоў,
Яе вам аддаём.

Дотык вуснаў тваіх,
Незямны боскі дар,
Нас сагрэе ўдваіх.
Вось і змыты цяжар,
Што ляжаў на душы;
Адзінота прайшла.
Дзень, святло патушы –
Наша зорка ўзышла.

# НОЧЧУ

Тулішся даверліва,
Спіш безабаронна…
Думак-мук барозны
Лоб мой рвуць вярэдліва,
Жорсткі гоняць сон,
Быццам лішні ён.

Вернасць грэе грудзі,
Дзякуй за каханне.
Цвеліць спадзяванне –
Лепшай доля будзе.
Шчасце да людзей,
Ты прыходзь хутчэй.

Мроіцца прытулачкам,
Цела цеплынёю.
Мяккай цішынёю
Ходзіць ноч завулачкам.
Ява спраў-турбот
Правіць думак ход.

Пакідайце, думкі, –
Прагну бесклапотнай
Восеньскай дрымоты.
Ласкай твае рукі
Горнуца абняць…
Спаць ці працаваць?

# КЛОПАТ

Што рабіць,
Калі жыць
Няма дзе?
Хто паможа ў бядзе?
Хоць з адчаю згары –
Дзе сябры?

Не скажы –
Ў шалашы
З любай рай,
Сам яго забірай.
Як любіць, працаваць,
Жыць і спаць?

Ува снах
Бачу дах
(Божа мой!)
Над маёй галавой.
Свой утульны куток,
Як выток.

Для другіх
На ўвесь дых,
Як званы,
Праектую дамы.
Сам бы з радасцю жыў –
Не здабыў.

Сокі йдуць –
Не вярнуць,
Як і час,
Адабраны ж у нас.
Хто заплаціць, скажы?
Будзем жыць.

## ПАЎДНЁВАЕ

Спякотай падсмажаны дзень
Тапталі па вуліцах горада.
Хаваўся, пацвельваўся цень,
Жаданна, і мройна, і горача.

Знайсці немагчыма куток,
Дзе можна было б прыпыніцца.
Каб смагі пазбыцца густой,
Пяшчоты нарэшце напіцца.

Бо смага і вусны, і рот
Спаліла.
Душу разам з целам.
Кашулі выдубліваў пот
І перафарбоўваў набела.

Зусім не такога цяпла
Імкнулі.
Другой асалоды
Упоперак рэчка цякла,
Але не адкрыла нам броду.

## ТЫ

Гарачыя рукі блукаюць,
Пяшчоты карункі плятуць.
То долу імкнуць, то ўзлятаюць,
Згадаць аб сабе не даюць.

Ірвецца на волю жаданне,
Нясцерпна вызвоньвае кроў…
Суцішыўся горад да рання,
Шукаць таямніцы пайшоў.

З табою заўсёды нязгасна –
Надзеі наноў ажывуць
На долю, на казку, на шчасце,
На верную зорку сваю.

* * *

Гайдала свае валасы –
Люстэрка смяялася з ёй,
Вясёлай каханай маёй,
Зліваліся ў тон галасы.

А хвалі ірваліся з плеч,
Ляцелі спакусліва ўніз,
Дзе рухаў прывабны капрыз
Прадвесцем салодкіх сустрэч.

І я засмяяўся ў адказ.
Цнатлівасць мой позірк бярог,
Хаця і дабраўся да ног…
Было, як у першы той раз.

## ПЕСНЯ ДАЖДЖУ

Мілая мая дзяўчынка, –
Слухай, як спявае дождж,
Шле багацце без супынку.
Ты сумненні не трывож.

Ён жадае дзетак многа,
Песню нам сваю пяе.
Хай размова льецца доўга
Пра наказ, што дождж дае.

Робяць як гулліўцы-струмні:
Ва ўсім свеце – толькі мы,
Каб пра будучыню думаць,
Спраўдзіць лёс свой на зямлі.

## ТАБЕ

Нам з табою ў дарогу карціць,
Быццам птушкам у сонечны вырай.
Да пяшчоты, цяпла паляцім,
Да зямлі, што пад белымі крыламі.

Дзе пад ценем самлелых лазін
Закалыхвае пошаптам Нёман.
Край дзівосных і родных мясцін
Нас з табою вітае без стомы.

Тут на поўныя грудзі дыханне,
І з лугоў асвяжаючы подых.
Тут сапраўднае свята кахання,
Разумення, яднання і згоды.

## ІДЫЛІЧНЫ МАТЫЎ

Я за плугам хаджу,
Ты ля печы стаіш, –
Дзень пачаўся яшчэ на дасвецці.
Вецярок пакрысе
Раскалыхвае ціш
І туман разганяе па свеце.

Наравісты мой конь
Не ідзе баразной,
У руках маіх спрыту не чуе.
Усё роўна нарэшце
Паладзіць са мной,
І мы хораша з ім папрацуем.

Пот кашулю шчыльней
Прыляпіў да спіны,
Ты ж у хаце ля печы шчыруеш.
Там пякуцца аладкі,
Са здорам яны
Смакам спеляцца – не адкаштуеш!

Што стагоддзі, што час –
Гэта ўсё як спрадвек,
Можа, толькі, з «талеркаю» хата.
Быў учора зусім гарадскі чалавек, –
А каня распрагае…
Араты.

## НА АДЫХОДАК ДНЯ

Знясілеў дзень спякотнай барацьбой,
Глядзіць патрабавальнымі вачыма.
На ноч прытулкам будзе нам з табой
Гумно-вястун з рыпучымі дзвярыма.

Гумно старое недалеч ракі,
Дзе велічна, павольна і разважна
Вада цячэ, люляе лазнякі –
Паслухаем, што нам яна падкажа.

Шапоча сена, рукі не стрымаць,
Вяртанне спёкі – узгараюць целы…
Тут не дадаць нічога, не адняць,
Так і належыць, як стаіць свет белы.

Цячэ вада, па камянях шкрабе,
Напятасць ночы ў пацалунках тоне.
Пяшчоты хвілі – і няхай табе
Прысніцца, што купаешся ты ў Нёмне.

## ПЯШЧОТНАЯ НОЧ

Оля спіць, хай не будзяць яе
Ані думкі мае, ні трывогі.
Ноч ціхуткую песню пяе –
Не прысняцца ёй сёння дарогі.

Дабрыла на сямейны агонь,
Наблудзіўшыся ў нашых расстаннях.
Ноч, пяшчотай яе запалонь
І сагрэй цеплынёю кахання.

А назаўтра збяромся мы ўсе:
Сына ўсмешка і сонца вітанне,
Пацалунак, абмыты ў расе, –
І разбудзім яе на світанні.

# СВІТАЛЬНЫ ВЕРШ

*Цімоху*

Я прывык не спяшацца,
хоць дыхае час за спіною,
Ды і бегчы куды?
Як гавораць, паспеем усе…
Лепей ціха прайдуся,
і сын мой хай пройдзе са мною,
Пойдзем з ім напрасткі
басаною па світальнай расе.

Хай запомніць з дзяцінства
пяшчоту цнатлівага ранку.
Дзе пануе наўкол
знітаванасць душы і святла.
І глядзіць нам услед
заварожана маці ля ганка,
Погляд матчын спрадвек –
гэта сонца сям'і і жытла.

Перадесак, лужок
і рака беларуская наша
Аж да болю твае,
уявіць гэта нават не мог.
Хай жа ведае сын мой
пра росныя пругкія пашы,
І як вабіць дадому
над комінам лёгкі дымок.

Я люблю летніх росаў
іскрыстнае чыстае ззянне,
Падымаецца сонца
і высушыць хутка расу.
Дзякуй, родныя гоні,
за тое, што ёсць гэта ранне,
Што пад небам Радзімы
я сына высока нясу.

# ПАЛЯНКІ ДРОБНАЛЕССЯ

Неўпрыкмет уцякаем у свойскі лясок
Ад вачэй недарэчных рупліва.
Лета, змова й жадання ўскіпаючы сок
Нас з табою забралі вірліва.

Апякае сухі ногі босыя мох,
Голкі хвоек гуляюцца ў ловы.
І сцяжынак ідзём мы наўзбоч, і дарог,
Каб не ведаў ніхто нашы сховы.

Плямы сонца між дрэў сустракаюцца спрэс,
Вось таемная гэта палянка.
Затаіўся ў чаканні па-змоўніцку лес –
Мы нарэшце адны, паланянка.

Апранахі на дол адлятаюць ураз,
Застаецца адзіна прырода.
Паміж небам, зямлёю і намі якраз
Паяднанне й пяшчотная згода.

Ты яшчэ не трываеш паглядаў маіх,
Сарамліва апушчаны вочы.
Блікі промняў на пекных мясцінах тваіх,
Куды я даімкнуцца ахвочы.

Смагі нельга цярпець больш ні хвілі адной –
Дачакаліся ўлады імгнення.
Нашых целаў жаданы салодкі двубой
Перастрэне спакой спаталення.

Не спяшайся назад, мы ў сусвеце адны,
Хоць зусім не Адам і не Ева.
Прычакана за спёкай прыходзіць заўжды
З навальнічным настроем залева.

## ПРЫМОВА

Цябе прымоўлю ціха да сябе
Лістотай слоў і восеньскім шпацырам.
Істужка мар зляціць і абаўе,
Падніме пругка над жыццёвым вірам.

Сярод няўцямных сполахаў начных
Цябе прымоўлю росна да кахання.
З табою нам сягоння на дваіх
Напой пяшчоты піць ажно да рання.

Ды не пазбегнуць студзеньскіх завей –
Цябе прымоўлю золка да расстанняў.
Каб ты чакала кожны раз мацней,
А пры сустрэчах прагнула адхлання.

Сама не згледзіш, як і час праб’е –
Знаёмства наша прарасце ды ў крэўнасць.
Цябе прымоўлю конча да сябе,
І так пазбудзецца твая няпэўнасць.



# АРЭЛІ ДАРОГІ

## САБЕ І ДРУГІМ

Хіба ў летнюю спёку, смугу
Непазбыўную смагу спатоліш?
Наталіцца табой не магу,
Хоць і часу было ў нас даволі.

Дзе сакрэт, можа ў тым, што цяпер
Разам вечар і разам світанне?
Ненадзейны наш час, ды павер,
Што бывае і сёння каханне.

Гэта вечна.
Так рэчка цячэ
Праз гады да свайго акіяна.
Кінеш бераг – вада апячэ,
Але потым аддзячыць адданасць.

* * *

Ой, вада, – без улады навала –
Абмывала, зближала, яднала.
Так і мы заручоны з табою
Тоелеташняй шчырай вадою.

Не марскою вадою – рачною,
Нашым лёсам даўно нарачонай.
Рэчка гэтая Нёмнам завецца –
Непазбыўна яна ў нашым сэрцы.

Тыя хвалі не проста ядналі –
Для жыцця напамінак давалі.
Вось і сын, і дачка ўжо купаюцца,
А рака ўсё цячэ, усміхаецца…

# МАТЫЛЁК

*Марыне*

Невядома, ён хто і адкуль прыляцеў
На малюнкі маленькай дзяўчынкі?
Ад квяцістай краіны ўцячы захацеў –
І сюды паімкнуў без спачынку.

Рознаколерны, дзіўны, увосень узнік
Успамінам чароўнага лета.
Вельмі гожа парушыў паперы цалік
І хавае, як сталася гэта.

Невядома, адкуль такі спрыт мастака,
Гэткі дар у маленькай дзяўчынкі.
Фарбы, стол, і малюе нястрымна рука…
Ёй вядома адной, якім чынам.

## КОЛА

Пасядзі, на мяне паглядзі,
За вячэрнім пагутарым чаем.
Там на неба залез маладзік,
Перамены ў жыцці абяцае.

А якія – не ведаць таго,
Можа, зноўку разлучыць дарога?
Пашукаем адзін аднаго,
Прыйдзем разам назад да парога.

А праз месяцы з'явіцца сын
І сям'ю назаўсёды зніту.
Нашы лёгкія светлыя сны
Паважаная поўня вартуе.

А праз час, зразумела, – дачка.
Круціць месяц жыццёвае кола.
Не ляці як з гары, пачакай,
Дай спыніцца і глянуць наўкола.

За пахучай гарбатай сядзім,
Ціха вечар гамоніць сямейны.
Ветах знік, і паўстаў маладзік –
Абяцае яшчэ перамены.

# НАЧНЫЯ ГУКІ

А горад ноччу завітае ў госці,
Вярэдзяць гукі яваю абрання.
Святой парой апавядае штосьці –
Няўжо гісторыю майго кахання?

…Там колаў грук. У тым і я вагоне,
Што стратай стаў нямілага вакзала.
Дарогі сум цябе заўжды агорне –
А што на развітанне ты сказала?

…Гудзе аэрапорт, і не падняцца
Падбітай птушцы – сілы не хапае.
Ўзлятаюць самалёты і садзяцца –
Чаму твой лёгкаплан не прылятае?

…Таксі ляціць –
                        у хуткасць не паверыш,
Чырвоны знік, цяпер не супыніцца.
Я да цябе – ты адчыняеш дзверы,
У першы раз павінна ўсё адбыцца…

За што вярэдзіш, правіну якую?
Было-сплыло.
Пакінь нас  у спакоі.
Нарэшце горада зусім не чую –
Патухлі гукі, бы святло ў пакоі.

## ВЕРШ ПРА СЯБЕ

Чародкай нягеглыя зімы
Знікаюць, і тчэцца бяда.
Дзе знік ты, Мароз Уладзімір,
Падаўся куды, гаспадар?

Мо нюхаеш па завуголлях
Мільённага горада тлум?
Душу прапіваеш без болю,
Нячысціку кінуў на глум?

Чужынцы смяюцца зласліва:
Знікае славяншчыны дух.
Нараніцу горкае піва
Бязладны працягвае рух.

Ці недзе гуляеш па свеце,
Апомніцца сіл не стае.
Згубіўся, а жонка і дзеці
Праплакалі вочы свае.

Зямля без цябе запусцела,
Дзіраваю стала страха,
І роднае слова знямела…
Пара мо ўжо пыл атрахаць?

Адкінь безнадзей і самоту –
Не  згледзіш, гадзіна праб’е.
Вяртайся, давай за работу,
Айчына прабачыць цябе.

## ТРАЛЕЙБУСНЫ СУМ

Агромністы рыжы тралейбус
Падхопіць няўрочнай парой.
Самотна разгадваю рэбус
Адносінаў нашых з табой.

Адчужаны руху ды ціску,
Пры людзях дарэшты адзін.
На шкле адмысловую рыску
Падводжу пад ростань гадзін.

Асфальт не дае засяроддзя –
Лагічную нітку ірве.
Нязладжаных думак разводдзе
Заблытала ўсё ў галаве.

З туману твой твар выплывае
За мутным тралейбусным шклом.
Журботная восень такая
І нас зачапіла крылом.

Штораз прапануе дарога
Прыпынкі, ды ўсе не твае.
Расстанняў ці мала ці многа? –
Разблытацца сіл не стае.

Мо проста заснуць з калыханкай
Нязнаных завулкаў душы?
Нарэшце ў абдымках каханкі
Ачнуцца й салодка зграшыць.

# ДВА ГАЛАСЫ

– Мяне памятай маладою, прыгожай –
У квецені сад ап’янелай парой.
На свята жыцця прывядзі асцярожна,
Ад часу схавай за кахання гарой

– Цябе памятаю цнатліва-прывабнай,
Расцвіўшаю кветкай на ўлонні зімы,
Дрыготкаю птушкай у пальцах нязграбных,
Што ўраз уляцела ў юначыя сны.

– Хавай у душы ты мой смех бесклапотны –
Гулліва-прызыўны дзявоцкі ручай.
За цуглі каня – крутабег незваротны –
Спыні ды адпрэч хвіляплынны адчай.

– Цябе захаваю душы хваляваннем,
Бяззбройнасцю пекнай адкрытай красы.
Сустрэч непазбыўных нясцерпным жаданнем,
Што тушыць навокал усе галасы.

– Мяне зберажы зіхатлівасцю ночы,
Адданасцю цела, пяшчотнасцю рук…
Ад шэрасці дзён забяры мяне ў прочкі,
Дзе толькі любові пранізлівы гук.

– Цябе зберагу, і не ўведаеш гора.
Ну што ты, каханая, што ты, не плач…
Імгненне спыніў, падарыць табе мора,
Парыж і дзівосы – не здолеў.
Прабач.

## ГАДАВІНА ШЛЮБУ

У бар у начны закарцела –
Паўзмрок, тытунёвы сувой…
Жаданне хвілінай паспела –
Знянацку ўцякаем з табой.

У першыя леты вяртанне,
Збоч вуліц, праз нашы двары.
Нягучнае музыкі гранне
Спакойна дае гаварыць.

Тут яваю нашы сустрэчы.
Падзякуй, што сталася так,
Што выплылі мы з калатнечы…
Размовы, кілішкі, каньяк.

Усё ж пачуццё ўзгадавалі,
Усходы прасілі вады.
Жыццёвыя згадвай паданні,
Пачуцца каб зноў маладым…

За поўнач.
З памкненнямі ў згодзе,
Хаця падступаюцца сны.
Збірайся, каханая, пойдзем,
Мо ёсць яшчэ бар дзе начны?

## НАЧНОЕ ІМГНЕННЕ

Накрыла ноч крылом сваім дарогі,
Слупы ад фар адно даюць святло.
Ляціць асфальт.
Але няма трывогі,
Бо побач ты – каханне і цяпло.

Трымае руль рука пад рух няспынны,
А позірк збег няўзнак імкліва ўбок.
Цішэй, матор.
І збочвае машына,
Патухла фар святло, і стаўся змрок.

Няўлоўны міг – адданых рук знямога,
І вуснаў смак, які сабе збярог.
Пяшчоты час.
Праб’юць у змрок дарогу
Слупы святла – абрысы спелых ног.

Па ёй імкну, зліцця жадаюць целы,
Астатні крок, каб жар душы аддаць.
Стаіць асфальт.
Дарога анямела,
Калыша нас, матораў не чуваць.

## ВОЗ

Ціха наш конік ідзе,
Хораша цягнецца воз.
Мякка на сене сядзець,
Сонечных лашчыцца кос.

Побач плыве сенажаць,
Ціха аб леце пяе.
Мякка на сене ляжаць,
Слухаць жаданні свае.

Поўна ў грудзях, як аддаць,
Песень сплываюць дымы.
Мякка на сене кахаць…
Так зачыналіся мы.

# ЛУГ

З лесу шлях нас дадому вядзе
Напрасткі па травіцы мурожнай.
Мы з табою ўдваіх, і нідзе
Аніводнай хмурынкі трывожнай.

Ад цябе і ад лета цяпло,
Падсвядома знікае самота,
Бо жаданне ў грудзях апякло,
Запрасіла прыпынку пяшчота.

Час сарваўся, прыспешыў наўскач,
Уляглася трава пад калені.
Божа наш, на імгненне прабач,
Мы ж укленчылі не на маленні.

Пад рукамі паўшар'і твае
Уцягальнай падзелены рысай.
Недзе там, як пагляд дастае,
Загушкалася хвойная выспа.

А за ёю і статак кароў
У абрысах пачаў расплывацца.
Узмуцілася любасцю кроў
І забрала – дарэшты аддацца.

І нічога нідзе не відаць –
Гэта водбліскі дня а ці ночы?
Мройна-мякка на красках ляжаць,
Калі сэрцы ў суладдзі грукочуць.

## ПАЎСТАНАК

Блукалі па свеце,
спатоліць каб прагу пазнання
Людзей і шляхоў,
і нязнаных прывабных мясцін.
Давалі прасторы
юнацкім сваім парываннем,
Юнацтва запал
нас уперад нястрымна каціў.

Жадалі кахання
з адкрытаю чыстай душою,
Выспельваўся час
будаваць гарады сваіх мар.
Гукалі сяброў
у паход па жыццё за сабою,
Работа ўбірала
душы і ўсялюдскасці жар.

Ізноў у дарозе,
жыццёвай струменістай плыні,
Імкнём да каханых,
што жонкамі сталі даўно.
Спяшацца не будзем
падводзіць рашаючы вынік,
Падводзіць не нам –
зразумела бадай што адно.

# ВОСЕНЬСКІ МАТЫЎ

*Марыне*

Я сёння табе не дарадца,
Дзяўчынка, што крочыш са мной.
Нідзе ад дажджу не схавацца
Такою самотнай парой.

Не згледзець жаданага выйсця –
У дрэваў ты схоў не прасі.
Ім цёмным, прамоклым, без лісця
Цяпер вось няўтульна зусім.

Але ў тым свая асалода –
У восеньскай слотнай хадзе.
Суровая сёння прырода
Усё ж не пазбавіць надзей.

З табою мы пойдзем дадому,
Дзе маці, святло і спакой.
Пакінь набрынялую стому –
Сплыве няхай часу ракой.

А дрэў не шкадуй ты дарэмна,
Яны пражывуць і без нас.
Сустрэнуць вясну неад’емна
У свой у прызначаны час.



# цішыня

# ВЯНЕЦ

Звон-вястун паплыве над нягодамі,
Перакуліцца поўным карцом.
Хору спеў адаб’ецца лагодаю
І апусціцца шлюбным вянцом.

Па абрадзе, прынятаму продкамі
Нас вянчае айцец Мікалай.
Старасвечныя мроі салодкія –
Тут паўстаў хрысціянскі наш край.

Як спрадвеку – стаім пад каронамі,
Князь, князёўна, ды свечкі ў руках.
Пуцявінамі вышнімі, горнімі
Асвячаецца любасці шлях.

Чыстасветлыя словы малітвамі
Напаўняюць прыцішаны храм.
Дабрадаццю ўсявышняй абліты мы
І святым прычашчоны дарам.

Умацуй, Божа, сілы душэўныя
Паяднанне пранесці ў любві.
Зберажы нашы повязі крэўныя,
І на праведнасць дабраславі.

## ЗА ГАРБАТАЙ

Вечар працы мяжу пакладзе –
Гаспадар уваходзіць у хату.
Рукі мые, да покуці йдзе,
Нетаропка смакуе гарбату.

Так утульна і цёпла сядзець –
Завіхаецца жонка ля печы,
Дзе агонь будзе мякка гарэць
І пяшчотаю сэрца палечыць.

А ў гарбаты мядовы настой –
Водар вуснаў каханай духмяны.
Райскім дзівам падасца пакой,
Пакідае стамлёнасць рахмана.

І душа без прынукі ўзляціць –
Гэты момант нязбыўна-адзіны.
Каля хаты бярозка трымціць,
У вакенца шкрабуцца галіны.

# СЦЯЖЫНКІ

А кола – скрып, а кола – круць,
Свой рэй вядзе неадмыслова.
Старыя сцежкі зарастуць,
Другія вытапчам нанова.

Адна да рэчкі па ваду
Калісь вяла пад шум лазовы.
Пайду знячэўку – не знайду
Пругменя з Нёмнам перазоваў.

А тая ў вёску па мяжы
Ад хутара таптала проста.
Прапалі межы, не кажы,
Як і ля броду гульняў востраў.

І да калодзежа вяла…
Буцвее й тут – вада ж у хаце.
Знайсці б які аскепак шкла,
Дзяцінства каб убачыць, браце.

Цяпер яно тваіх дзяцей.
Для іх і свежая сцяжынка
Праз новы лес, бо так лацвей,
Бліжэй вада і азярынка.

І ўсё ж да Нёмана, і ўсё ж
Нязменны й звонкі спеў птушыны,
Без змен і ранак басанож…
А каля хаты – след машыны.

* * *

Я асуджаны быць маладым –
Хоць у дваццаць гадоў, хоць за сорак.
Часу зверхнасць сплывае як дым,
Ён не сябар табе і не вораг.

Мо калі і хацеў дапячы,
Ды ратунак мой лепшы на свеце:
Сына першае слова гучыць,
А старэйшаму ўжо паўналецце.

І не надта дастанеш другім:
Бачыш, людзі тамы напісалі…
Славы зверхнасць знікае як дым –
Разбірайцеся з гэтым вы самі.

Колькі дадзена словаў табе,
Столькі скажаш – ні меней, ні болей.
Часам шчырым аддацца сяўбе –
Узараць сваё белае поле.

Як не быць тут наўсцяж маладым? –
Проста гэта ёсць сіла ратая.
Тлум быцця адплывае як дым,
Толькі зверхнасць любові трывае.

* * *

З майго жыцця не выхапіць радка,
Не выкінуць ані, бы слова з песні.
Накрэсліць шлях Нябачнага рука –
Ідзі наўпрост у звонкі ранак весні.

Каб так было…
Няварта і казаць,
Блудзіў наўзбоч, віхлялася дарога.
Сцяліў у цемры на ратунак гаць,
Калі не зглядзець побач анікога.

Ды зводзіў зноў атручаны напой,
Кружляў вакол зачараваных соснаў.
І кайстра спраў была да дна пустой,
І слоты смак увосень піў удосталь.

Да рысы той ужо ступіў, калі
Магла аблуда стаць наканаваннем.
І каб дарэшты не згубіць любві,
Я да Яго прыходзіў з пакаяннем.

Што сёння ёсць – судзіць, бадай, не мне.
Але калі дахаты на дасвецці
Вяртаешся – гарыць святло ў акне,
Чакаюць там каханая і дзеці.

## ПЛАЧ НЕМАЎЛЯЦІ

Над калыскай турботна схілілася маці
Ашчадзіць птушанятка сваё ад завей.
Гэта жальба-журба, гэта плач немаўляці
Сярод ночы падняў супакоіць хутчэй.

Плача хлопчык маленькі адчайна і скрушна –
Той часінай святое згарае ў агні.
Гэта плач немаўляці па згубленых душах,
Расцярушанай светам былой чысціні.

Не пачуе яго, хто згубіў сваё сэрца,
Хто не ў стане трывогу і смутак адчуць.
Гэта плач немаўляці – душа скаланецца,
І да раніцы болей ужо не заснуць.

Кожны з нас за грахі па рахунку заплаціць,
Незваротна сваю атрымае юдоль.
Я трываць не магу гэты плач немаўляці –
Лепш бы сам нёс заўжды яго крыўду і боль.

Проста сёння пакуль у тваіх яшчэ сілах
Да грудзей прыхіліць, ахінуць цеплынёй.
Гэта плач немаўляці на роспачных крылах
Прадчуваннем ляціць над збалелай зямлёй.

Будзе слёзаў даволі ў жыцці, без сумнення,
За адкрытасць адплата, каханне й давер.
Гэта плач немаўляці, застыласць імгнення,
Маё сэрца дазвання вярэдзіць, ірве.

# МАЛОДШЫ СЫН

Сонца прамяніста ўскаласіла,
Ахінае хату дабрадаць.
Добрай раніцы, спадар Даніла! –
А яму не хочацца ўставаць.

Сон усцешны проста да знямогі
Па-за часам, мітуснёй і злом.
Не яго наўкол шляхі-дарогі,
Схоў пакуль пад матчыным крылом.

Вып’еш дзе пяшчоты гэтак многа,
Без маны адданасць знойдзеш дзе?
У абдымках хлопчыка малога,
Што за ўсё ў жыцці найсаладзей.

Уставай у сонечнае ранне!
Неўсвядомлены дзіцячы рай –
Ты, бацькі, і хутар, і світанне…
Гэта назаўжды запамінай.

Хай жыве наўсцяж любові сіла,
Чым мацуецца радзінны звяз.
Добрай раніцы, спадар Даніла! –
І усмешка шчырая ў адказ.

# ДРАНІКІ

Сняданак любові – на кухні сям'я за сталом:
Маленькі Даніла, Марына, Цімох пасталелы,
Ды Вольга й Валодзя – бацькі.
Ахінае крылом
Святая нядзеля, што свет уратуе збалелы.

Палае агмень, ён жытло саграває заўжды,
Даруе нам хлеб, і не толькі надзённы адзіна.
На хвалях лагоды нас хутар стары-малады
Гайдае, і песціць, і корміць – яднання часіна.

А дранікі мяккія самі аж просяцца ў рот,
На сале засмажаным сілы набраліся ў печы.
Смятана падлашчыць – заўзяты стаіць умалот,
Жыццёвая жорсткасць сягоння не цісне на плечы.

Канстанты быцця.
Як і дзён пераемных сувой,
Над комінам дым, зеляніна травы маладая,
Як пошум стагоддзяў сівых па-над Нёмнам-ракой,
Адвечная плынь пра якія няўзнак нагадае.

Няблізка-далёка зацятасць між злом і дабром –
Тут Бог ашчаджае мясціну радзінную гэту.
Гады праімчацца наўскач,
А сям'я за сталом
Навек застанецца апораю беламу свету.

## ЦІШЫНЯ

Крыж вартуе мой хутар –
Адплыла далячынь.
Адлучы свой кампутар
І душу далучы.

Цішыня, глянь, якая –
Ні лісток не шуміць.
Ноч прыйшла трапяткая,
І душа не баліць.

Зоркі ў небе спагадна
Свецяць толькі табе.
Загадай неадкладна –
Час любові праб’е.

Побач лесу дыханне
Мілаты дадае.
Дарагое адхланне
За трывогі твае.

Хата вокнамі свеціць –
Спаконвечнасць жытла.
Твой куточак на свеце,
Твой праменьчык святла.

Заўтра зноўку дарога –
Хай набудзецца сіл.
Трохі шчасця зямнога
Каля крыжа прасі.

## У ЧАТЫРЫ ВОЧЫ

Сядзім з табою ў чатыры вочы,
Сагрэты вышнім любві цяплом.
Ніхто не зможа цяпер сурочыць
Кахання свята, наш ціхі дом.

Нарэшце тут вось адны ў сусвеце –
Нясцерпна доўга вялі шляхі,
Дзе рай так блізка, дзе мы як дзеці,
Якіх не ціснуць жыцця грахі.

За шклом чаромха ва ўбранні белым –
Вясновы водар хвалюе кроў.
Маўчым сягоння аб адбалелым,
Вярэдзіць раны не трэба зноў.

Агонь знішчальны закуты ў печы,
Нічога болей не спаліць ён.
Адны з табою, такія рэчы,
Салодка-мройных жаданняў сон.

## КАНСТАНТА СЯМ'І

Дзіўнай музыкі коцяцца хвалі –
Завіруха мяце за акном.
Што адзін аднаму пажадалі,
Тое спраўдзіцца, прыйдзе дабром.

Нам не  трэба багацця зямнога –
У любові адзіна пражыць.
Ласкі шчырае хопіць у Бога,
Каб звінелі ў душы капяжы.

Каб гучаў хваласпеў дабрадаці,
Пазначаў у цямрэчы святло.
Цеплыня каб трымалася ў хаце,
Каб прамяніла ўтульнасць жытло.

Дзеці спяць – супакой і адхланне
За бясконцасць дарог і трывог.
Зберaглі ў нашых сэрцах каханне,
Што не кожны, напэўна, і змог.

Хай віруе ўсю ноч завіруха,
Не замесці ёй след аніяк.
Ловіць чуйна адкрытае вуха
Патаемнасці боскае знак.

## КАХАНАЙ

Не кахай мяне, калі я злосны,
А кахай тады, калі ў лагодзе.
Лета светла вытча свае кросны,
Фарбаваць пакіне прахалодзе.

Не кахай мяне, калі сумую,
А кахай тады, калі бадзёры.
Фарбы гэтыя табе дарую,
Дарагія восеньскія ўзоры.

Не трымай мяне, калі ў дарогу
Разам з песняй і душа ірвецца.
А трымай тады, калі трывогу
Раптам роспачна пачуе сэрца.

Не гукай мяне ты з адзіноты,
Сустракай тады, калі вярнуся.
На сканчэнне бездаражы, слоты
Я табе з удзячнасцю ўсміхнуся.

## ВАННЫ ПАКОЙ

Пачынаецца быццам бы смехам,
Мілавання гульню пазнаю.
Ты пад душам – няспехам і спехам,
Бо на варце ў чаканні стаю.

Наталіцца табой немагчыма,
Пекната заварожвае зрок.
Я цябе забіраю вачыма,
Паміж намі адзін толькі крок.

Пар разліўся па ванным пакоі,
Запацела спагадна акно.
Тут сыходзімся ў жарсцкім двубоі,
У абдымках зліемся ў адно.

Дзе мы зараз – не можам уцяміць,
Толькі кроў адбіваецца ў скронь.
Не сціхае пяшчотная замець,
Раздзімае спатольны агонь.

Засталіся адны ў цэлым свеце,
Хай віхурыць знадворку зіма.
Што тут зробіш – дарослыя дзеці,
Для якіх нат узросту няма.

* * *

Пакінь адзенне, хто сюды ўваходзіць,
У гмах кахання стромкі для дваіх.
Жаданняў золкіх рупіцца нязводдзе,
Сустрэч салодкіх незваротны міг.

Абдымкаў звяз ад свету адняволіць,
Дрыготкай хваляй прыбяжыць няўзнак.
Гульні хвіліны цягнуцца паволі,
Ты не прыспешвай насалоды смак.

Паўней пяшчотай пругкай наталіцца,
Да донца любасць выпіць нам з табой.
Гуляе блізка недзе бліскавіца,
Чакае толькі пэўны момант свой.

Святлее змрок шторaз ад нашых целаў,
Збавення стан агорне цеплынёй.
Спазнаны крык сарвецца грушай спелай,
Сваволіць рэха над усёй зямлёй.



# АДВЕЧНАЯ ПЛЫНЬ

# НОЧ ЗАМКНЁНЫХ ДЗВЯРЭЙ

Ох, і горкая кава,
Ох, і цяжкая ноч,
Калі рупіцца справа
Перадыхаў наўзбоч.

Затрымцяць – тут жа знікнуць
Мілавання званы.
Хоць узімку памілуй –
Не турбуй да вясны.

Бо абраны на службу
Весці праведны рэй.
Дай самому адужаць
Ноч замкнёных дзвярэй

Толькі даўнія продкі
Сёння побач са мной.
Іх дыханне ды крокі
Адчуваю спіной.

Мо адкрыецца тайна –
Да Айчыны бягу.
Не хачу, каб расстайна,
За сустрэчна – змагу.

Вось пазнаюся ў часе,
Паяднаю вякі…
Не да груку абцасаў,
Час зусім не такі.

## ЛЕГЕНДА

Давайце паставім на мір
І тое змацуем вяселлем.
Леонія і Радамір
На покуце
                шлюбным паселі.

Крыжацкага роду дзяўчо
З крывіцкім пабралася сынам.
Ад воч захінала плячо,
Смак вуснаў
                  цнатліва-палынны.

Каханне ўзняло над зямлёй,
Над часам скрываўлена-росным.
Шаўковай змяінай касой
Яно паяднала
                     іх лёсы.

Праменіла згода наўздзіў,
І бацька нашчадку быў рады.
Па веры дзядоў ахрысціў
Ён сына
             усходнім абрадам.

Але пераменлівы час:
Замір'е зацемнілі хмары.
Нястрымны раз'ятраны Марс
Ізноў патрабуе ахвяры.

З пагоняй пайшоў Радамір
Мячом бараніць свае землі.
Хаўтурны мацуецца пір
І чырванню рупіцца вельмі.

Леоніі плач не адзін
Над светам ляціць аблачынай.
– Дзе тата? – пытаецца сын.
– Загінуў
за нашу
Айчыну…

* * *

Пераменяць лясы – паміраюць і зноў узрастаюць,
Адступаюць балоты, губляюць свой дух трапяткі.
Гарады мкнуць ушыркі, а вёскі старыя знікаюць,
Толькі рэкі нязменна цякуць праз гады і вякі.

Гэта сведкі жывыя цярплівай гісторыі нашай,
Шмат чаго за стагоддзі пабачылі іх берагі.
Безліч хвалі хаваюць, але і багата раскажуць,
Толькі слухаць умей, калі край твой табе дарагі.

Я пра злучнасць з ракою, адчуць каб стагоддзі былыя.
У паўдзённай смузе зараз выступіць ратнікаў строй –
За Радзіму ідуць несупынна, навекі жывыя,
І знікаюць навечна пад чыстай, як слёзы, вадой.

А вада нараджае з глыбінь і пяшчоты жанчыну,
З чысціні ды кахання дае тая свету дзіця,
Што становіцца родным, адданым зямлі сваёй сынам…
Рве на звівах рака, павуцінне ірве забыцця.

# СПАС-ЕЎФРАСІННЯ

Бялізну дзяўчо паласкала,
Цякла Палата ля жытла.
А Спас-Еўфрасіння стаяла,
Адчужанай нейкай была.

Бярозак, вясною прыбраных,
Адно што прыветны быў стан.
Я дойлідам быў закаханым,
І звалі мяне Іаан.

Праз вузкую цёмную браму
Ішоў, бо надзею бярог,
Да белага чыстага храма.
А мо я не той, не дай Бог?

Усё ж прыняла, не адкінула,
Паверыла – твой я, свой!
А значыць, яшчэ не загінуў.
І стаўся нарэшце спакой.

На крыж пажагнаўся нясмела,
Над ім аблачынка плыла.
За ўсіх, хто любіў, адбалела
Душа, але чыстай была…

Я рукі абмыў палачанскай
Вадою.
Убачыў адно,
Як промні з лагодай славянскай
Высвечвалі чыстае дно.

* * *

Славянскія вочы ў імгле і тумане,
І ў змроку густой мітусні, –
Мяне падымалі, каб жыў не ў падмане,
Каб збег надалей ад хлусні.

Славянскія вочы…
Дзяўчынка-дзяўчына,
Прабач, калі нешта не так.
Хай сам зразумее, дзе скрухі прычына,
Стамлёны хлапчына-бядак…

# РАСКАЗ АБ НЯЗДЗЕЙСНЕНЫМ КАДРЫ Ў ФІЛЬМЕ ПРА МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

– Банальна, рэдактар, – жанчына і мора,
Валун на ўзбярэжжы, прыбой…
– Я ведаю сам, сам дадам табе зоры
Ці сонца світальнай парой.

Не тое зусім тут – патрэбна мадонна,
Цнатлівасць жаночай красы.
Амаль бесцялесна ў бязважкасці соннай,
Як чыстая кропля расы.

Ухопіш абрысы адно што – не болей,
Прыроды тварэнне й працяг.
Я думаю, можна тут даць сабе волі,
На свет паглядзець, як дзіця.

Мажліва, хацеў ён жанчыну зямную
Ля сіняе бухты кахаць.
Але нават сонца, бадай, не ратуе,
Хваробу ніяк не стрымаць.

Адно застаецца – згадаць пра каханне,
Жанчына была – не была?
Аддаць нам свае маладыя жаданні,
Душа каб да шчасця плыла.

# ШЛЯХ МАЙСТРА

Надыходзіць пара,
Надараецца час,
Калі робіцца ўсё пустазвонным.
Майстру трэба спакой,
Ён стаміўся ад вас,
Вашай прагі аб хлебе надзённым.

Ператрусаў ліхіх
Не сціхае прыбой –
Ён знямогся ад жорсткасці свету.
Для падбітай душы
Майстру трэба спакой,
Каб не збочыць свайго запавету.

Да аблуды наўпрост
Пуцявіна вяла –
Чалавецтва датупала краю.
Майстру трэба спакой
Зла наўзбоч і дабра –
Ён не хоча ні пекла, ні раю.

Майстру трэба спакой,
Каб сваё адпісаць,
Наастачу адкінуць змаганне.
А Гасподзь пашкадуе,
Дашле дабрадаць –
За знявагі і крыўды адхланне.

Майстру мроіцца дом
Па-над ціхай ракой,
Дзе да неба дарога адкрыта.
Больш нікога наўкол.
Майстру трэба спакой,
Ды каханне яго, Маргарыта.



# ЗНІЧКІ

# ЗГАДКІ АБ ПЕРШАЙ СУСТРЭЧЫ

Пяшчотныя ўсплёскі вады,
Усхліп цішыні над ракою.
Ці мог я падумаць тады,
Што страчу самоту спакою?

Рака падаруе цябе
Адзіна, навек, незваротна.
Сустрэча няўзнак абаўе
Каханнем і летам спякотным…

Папраўдзе – не летам, маню,
Хоць рэчка была, ды і бераг.
Зімой незалежнасць сваю
Згубіў.
Але ў шчасце паверыў.

На мосце старым, як гады,
Пад сіверным ветрам стаялі.
Абдымкі і жар малады
Ад рэчкі скаванай хавалі…

А летам – бо доўга з табой,
Ад снегу шукалі сустрэчы.
Успомнім – і разам з вадой
Расстанні надоўга адпрэчым.

## ЗІМОВЫЯ ЗГАДКІ

Апранахаў усцягваю воз –
Паратунку іначай няма.
Гэта значыць – прыціснуў мароз,
Узялася ўладарыць зіма.

А патрэбны цяпло і спакой,
Раўнавага жытла і душы,
Ды з камінам утульны пакой,
Каб вуголле ўсю ноч варушыць.

Хай гарыць – не шкадуй, не бядуй,
Пералівамі ўсцешышся ўсмак.
Па жарынках пачуццяў пайду –
На паперы пакінецца знак.

Па зіхоткім па снезе пайду –
Хай цяпер кажушок саграе.
Лёд уладна спалоніў ваду,
А я вусны спалоніў твае.

На сцяжынцы ўдваіх мы з табой,
У абдымках дзівосных мясцін.
Хто прыдумаў сустрэчы зімой?
Хто на холад наш край пахрысціў?

Ды каханкам не страшны мароз –
Там, у цёплым пакоі, камін.
Як гадоў адкалышацца воз –
Будзе цёплым зімовы ўспамін.

* * *

Ці быў гэты снег, ці яго не было,
Ці шчасце было ды заўчасна сплыло?
Так знікла надзейна, што знаку не стала.
Пяшчоты ўспамін – хіба гэтага мала?

Імчалі нас коні, быў стромкі іх бег,
А снег дабіраўся да самых да стрэх.
Бялюткасць яго кажушок твой чырвоны
Якраз адцяняў, і звінелі падковы.

А мой жа кажух птушкай-гракам чарнеў,
Я вусны твае аддаваць не хацеў
Ні ўзлескам, што спрэс сустракаліся нам,
Ні вольнаму шляху, ні белым палям.

А потым у хаце, дзе мройная печ,
Цнатлівасць тваіх адкрывалася плеч
Я іх цалаваў, мілаваў твае грудзі
І думаў, што гэтак навечна і будзе.

Ды толькі сыходзяць снягі па вясне,
І думаць забылася ты пра мяне.
Прапалена печ, а цяпла не хапае,
Пяшчоты ўспамін…
Я чакаю, чакаю.

# АПОШНЯЯ НОЧ

Бязгучныя словы засмяглымі вуснамі цягнуцца,
Застыў, быццам, час – і нашто турбаваць яго словамі?
Лепш так праляжым у маўчанні турботным да раніцы,
Што хутка, як птушка, няўзнак праляціць над галовамі.

І белая просціна ветразем белым здаецца,
Плывём пад якім мы з табою, бадай, нікуды.
І толькі грукоча – суцiш! – неспакойнае сэрца,
Грукоча ў цішы, гэты рытм – прадчуванне бяды.

Як быццам расстанне крылом нас ужо зачапіла,
Святла не счакаўшы, пякельнае ў душы ўвайшло.
О, Божа, адчай пераўжыць папрашу ў цябе сілы,
Прабі хоць надзеі прамень мне праз цьмянае шкло!

Чакаем світання. Наперад усё ты ўжо ведаеш,
Што будзе і як, што патрэбна зазнацца з пакутамі.
Нам разам з табою прайсці чалавечую бездараж –
І толькі ў канцы чысцінёй заблішчыць першапутак.

## ПЕСНЯ

Я нарэшце адкіну сумненні свае навырост,
Весткай блізкай сустрэчы пашлю, як лісты, аблачынкі.
Да цябе, да цябе перакіну над Свіслаччу мост –
Тут уброд напрасткі аніяк перайсці немагчыма.

Гэтай весткі чакаеш напята ў сваёй адзіноце,
Гэтай стрэчы імкну да пякучай трывогі ў грудзях.
Берагі аб’яднае дугою ў адзіным пралёце
Мост над Свіслачу наш, пачуцця многалучнага птах.

І сустрэнемся мы, каб ніколі ўжо не развітацца,
Ахвяруе нам Свіслач спакой нетаропкай вады.
Пабудуйма масты – да каханых сваіх перабрацца,
Каб не марна сплылі з незваротнай вадою гады.

## ЮНАЧЫ ЎСПАМІН

Дзяўчынка, прыхільніца максі,
Як звалі цябе – не згадаць.
Мільгнула, як знічка, і згасла,
Імя не схацела сказаць.

Размовы зусім немагчымы –
Шпурляў і выхільваўся рок.
Спаткаліся толькі вачыма,
Наступны не зроблены крок.

Той вечар хацелася доўжыць,
Да самага рання з ёю быць.
Дзяўчынка ў спаднічцы прыгожай –
Жаданне каханне ўявіць.

А дзесьці чакалі вакзалы,
Шляхі абяцалі гайдаць…
Імя ўсё ж свайго не сказала,
Саромеўся я запытаць.

# ДАНСКІ МАНАСТЫР

Маскоўскае лета. Нячутна ступаю
Уздоўж манастырскіх муроў
Да брамы ўваходнай.
Душа не пытае –
Сама ўстрапянецца ізноў.

Успомняцца нашыя ціхія крокі,
Пяшчоты цнатлівай крыло.
Той дзень пацалункаў адчайна далёкі,
Усё, што ў нябыт адплыло.

Але засталося: адданасць, удзячнасць,
Няўзнак пачуццё цеплыні.
Напэўна, усё можна страціць і страчваць,
Адно б не згубіць – чысціні.

Вялікі сабор адыходзіць у вечнасць,
Схаваўся за моцнай сцяной.
Сумненні знікаюць, яны недарэчы –
Усё застаецца са мной.

* * *

Вельмі хутка накоціцца ноч –
Гэта значыць, прыспешвае восень.
Забірае цяпло ўсё, апроч,
Што ад лета ў душы засталося.

Нашы стрэчы з табой над ракой,
Дзе ў пясок камянюкі ўрасліся.
Пацалункаў спякотны сувой,
Шапаценне лазы: распраніся.

Загарэласць плячэй апячэ,
Потым белыя плямкі адкрыю.
Ціха Нёман унізе цячэ,
Мы з табой адлятаем у вырай.

Узнясенне імгненным было –
Вось і лісце з лазы ўжо злятае.
Лета нашых спатканняў сплыло,
Рэчка брод свой у холад хавае.

## ЦЯЖКІ СОН

Ногі ватнымі зробяцца ў сне –
Божа мілы, навошта караеш?
Даганяю няўклюдна цябе,
Агукаю, але ты знікаеш.

Упіраюся ў шэрані мур,
Быдта рыба, паветра хапаю.
І паскардзішся зараз каму?
Немым енкам стагну ад адчаю.

Плямы снегу, аголенасць дрэў,
Нападступная бездараж слоты…
Як баяўся, чаго не хацеў –
Так і выйшла – вяселле самоты.

Як ступіць без цябе за парог,
Не ўва сне, а наяве, напраўду?
Усё вытрываць конча я б змог,
Толькі як перажыць гэту здраду?

Атрымаў за адданасць сваю,
І чаму – не даўмецца адразу.
Суцяшэнне: двух бітых даюць –
Не па мне за такую паразу.

Можа ўсё гэта пройдзе бы сон,
І нарэшце залатвіцца ў высях?
Крык апошні ляціць наўздагон:
Я кахаю, кахаю, вярніся!

# СПАГАДА ДАРОГІ

Калыханкі паслухай дарожнае
Для адхлання стамлёнай душы.
Забірае ў палон, прыварожвае
Шоргат шын па вільготнай шашы.

Самаходы пажадліва коламі
Выпіваюць прасторы нагбом,
Падвываючы ціха, маторамі
Аддаюць кіламетры на злом.

Пралятаюць дамоў, несупынныя,
Толькі ты непрытульны стаіш.
Ці даруюць усе, каму вінен я? –
Адпытаецца вецер-скавыш.

Тармазні, брат, падкінь да нязнанага,
Да кахання шляхі пакажы.
Дай спакою дабрацца жаданага,
Каб патухлі згрызот міражы.

# ТУМАНОВАЕ КОЛА

Густы туман каўтае першы снег,
З'ядае прагна, люта, ненажэрна,
Праявіць бруд, прысыпаны наспех –
Тым чысціню заб'е неміласэрна.

Будзённы тлум знішчае твой імпэт,
Да шчасця глуха зачыняе дзверы.
І не згадаеш, быў ці ты паэт,
Які кахаў, надзеяй жыў і верыў.

Суворы час, калі ніхто з табой
Да прышласці любові не пакрочыць.
Спрэс блуд душы, разлад і непакой –
Туманам дні падроўнены да ночы.

Але душа ўсё прагне любаты,
Ружовых мараў, пекнасці і шчасця.
Калі ж, калі бязладдзем нематы
На дабрадаць адведаем прычасця?

Быў першы снег – і вось яго няма,
Меў чысціню, а сёння енчыш: дзе я?
Туманных дзён адольвае гурма –
Што твой адказ і што твая надзея?

## РАЗ’ЯДНАНАСЦЬ

Маладосць мы з табой разгубілі
На крутых паваротах жыцця.
Неашчадна вясновыя сілы
Парастрэслі на радасць чарцям.

І каханне разбілі ў аскепкі –
Нашу еднасць як склеіць наноў?
Не ратуюць спатканні-налепкі,
Што здараюцца водгуллем сноў.

Мкнецца ўшыркі расколіна тая,
Што ўсё больш раз’ядноўвае нас.
Я душою пад небам лятаю,
Потым грукнуся вобзем не раз.

Ты ж належыш будзённым турботам:
Дзеці, дом і работа твая.
Адбіраюць гады незваротна
Нашу крэўнасць; ты тут, а там я.

І таму разуменне губляем,
Раз’яднанасць балюча пячэ.
Паміж радасцю й горкім адчаем
Неспадзеўкі жыццё працячэ.

Пачакай, прыпыніся, успомні,
Як мы марылі разам з табой.
Светлых згадак пяшчотныя промні
Хай адпрэчаць вястун-лістабой.

# ЛІРЫКА КАХАННЯ

## (у кайстру адсутнай літаратурнай палемікі)

Каханне любіць скрэмзанасць паперы,
Адно каб сталася лягчэй.
Хаця,
Дзе словаў шмат і вобразаў звыш меры,
Там шчырасці бракуе й пачуцця.

Бо невымоўна гэта, безназоўна,
Хоць не складаны ўвогуле сюжэт:
Яна і ён – душа чаканнем поўна,
Калі жыцця адкрыецца сакрэт.

Няхай гучыць літанне як прымова,
Адзін радок – і запульсуе кроў.
Бруіць зямнога й незямнога змова,
Дэталь адна ўсё раскалыша зноў.

А ты свае выпісваеш згрызоты,
Хутчэй на продаж, чымся для душы.
Каханне ціха адыйшло на потым –
Каго ты зможаш так разварушыць?

Няхай на продаж, толькі каб ад сэрца,
А не эстэцтва дзеля, проста так.
Любоўны сверб ніяк не адгукнецца,
Адно паветра скалане няўзнак.

Лірычны кліч – надзейная падмога,
Яе паэт хапаецца найперш.
Калі кахаеш – выведзе дарога,
Пяшчота словам увальецца ў верш.

# АРАБІНАВЫ ДОЖДЖ

Ціхім дажджом арабін
Восень наўсцяж сустракае.
Крочу праз чырвань адзін –
Сёння планіда такая.

Роўна палова ўсяго –
Голых галін і што з лісцем.
Шляху кахання майго
Дзе ратавальнае выйсце?

Ведаю: ты без мяне
Крыж свой нясеш адзіноты.
Хай лістабой абміне
Нашы бяззбройныя цноты.

Сэрца баліць, што не змог
Золкіх расстанняў пазбыцца.
На скрыжаванні дарог
Стрэча павінна адбыцца.

Вуснаў з гаркавінкай смак,
Любай адданыя вочы.
З ростані сыйдзем няўзнак,
Разам праз чырвань пакрочым.

Вецер сарваным лістком
Месца ля рэчкі пакажа.
Там пабудуем свой дом –
Лёс наш надзейна развяжам.



# САЛОДКА-ГОРКАЯ ПАЭМА

## ДЗЯВОЧЫ СМЕХ

Зіхоткая снежная роўнядзь,
Жывы маладосці абшар
І грудзі, і сэрца напоўняць
Узнёсласцю спраўджаных мар.

І смех развярэдзіць дзявочы,
Уцягне ў сіло таямніц.
Паблісквають поклічна вочы
Дасціпных такіх чараўніц.

За жартамі безабароннасць
Прывабнасці ім дадае.
На пекнасць фігураў ды стройнасць
Увагі пакуль не стае.

Разгледзішся хіба зімою? –
У шубкі схаваліся ўсе.
Такою чароўнай парою
Нам лёс падарункі нясе.

На смех адгукаюцца дрэвы,
Вясельна галінкі звіняць.
Накоцяць пяшчоты павевы
З жаданнем адным – паяднаць.

Узрушанасць нас забірае,
Абодвух адразу ў той час.
А слёзаў юнацтва не мае –
Самоты наперадзе сказ.

# ГАРАЧАЕ ВІНО

З тых дзён, што мінулася мноства,
Мы нешта хаваем, нясём.
Успомнім жа наша знаёмства,
З якога і сталася ўсё.

Марозны, нат з сіверам вечар
Сягоння вядзе ў Новы год.
На станцыі ціхай сустрэча –
За горад святочны паход.

Дружбацкай кампаніі вольна,
І жартаў, і досціпаў воз.
Яшчэ незнаёмыя? – Вольга,
А вось Уладзімір Мароз.

Пальчаткавы поціск бязважкі,
Прынадна-хвалюючы смех.
Цяпер ухапіць яшчэ цяжка:
Знаёмства на радасць ці грэх?

Аўтобус, бы цёплая скрыня,
Праз холад нас порстка імкне.
Застылая зорка прыпыніць
І браму на баль адамкне.

Утульны маёнтак страчае,
Зіхоткая елка ўначы.
Гуляй жа, душа маладая! –
Гады яшчэ рана лічыць.

Бярэцца між кухняй і залай
Нязмушанасць і мітусня.
Дзе наша яшчэ не прапала? –
Не ўведаць, што будзе пасля.

А сёння збываюцца мары,
Шчаслівымі стануць усе.
Пасыплюцца тосты, і твары
Пачнуць ружавець пакрысе.

Віном паяднана сябрына
Гарачым, што кліча настрой.
Памалу сатчэ вечарына
Нябачную повязь з табой.

Яе Новы год паяднае
Пад музыкі лёгкі прыбой.
Агонь у каміне палае,
Хавае сакрэт нейкі свой.

Астудзяць халодныя сені,
Схаваюць ад гукаў другіх.
Зліюцца ў адзін нашы цені,
Саб’ецца дыханне на міг.

І сыдзе на нас пацалунак,
Той першы, як знак пачуцця.
Жадана-салодкі ратунак
Свайго маладога жыцця.

І ноч праляціць бы імгненне,
Зацягне ў пяшчоты багно.
П’ём прагна, ды без наталення
Гарачае вуснаў віно…
Марозны засмужаны ранак
Нарэшце ўвабраўся як след.
Рыпучы падношаны ганак
Вядзе ў рэчаіснасці свет.

Ды нешта рэальнасці мала –
Хоць шолах вышуквае слых.
Дружбацкай сябрыны не стала,
Мы толькі з табою ўдваіх.

Ідзём першапуткам бясконцым
Між дрэў ціхаказачных, там,
Дзе свечкі-галінкі ад сонца
На шчасце запалены нам.

Ды толькі вось мост абарваўся
Над лёдам пакрытай ракой.
Нябачны цягнік аказаўся –
Хацеў мо парушыць спакой?

Не ўдасца цяпер анікому
Да скону ўжо нас разлучыць.
Цябе я праводжу дадому –
І гэты наш шлях не забыць.

# САЛОДКАЯ КРАМА

Накоціцца з пільнай нагоды
Прадвесцем сустрэчы ізноў:
– У восем, ну там, дзе заўсёды…
Прыціхлае водгулле слоў.

Салодкая крама «Ласунак»,
Стракаты вітрынаў узор.
Праспектавы звыклы малюнак –
Людзей, што спяшаюцца, збор.

Адзін аднаго не кранае,
Бо клопат у кожнага свой.
Ці мала каго што чакае
Вясновай гуллівай парой.

Насупраць гадзіннік на вежы
Нервова адлічвае час.
Са мною чаканню належыць
Не першы, на жаль толькі, раз.

Ліст бляхі, што крые прыямак,
І мой чаравік не праб'е.
Сустрэчы паветраны замак
Узводжу я ў думках сабе.

Людзей там няма анізвання,
Вітае нас мяккім цяплом
Камінная зала кахання,
Дзе кветкі палаюць агнём…

Папраўдзе, цукеркі ды кветкі
Былі не ў пашане тады.
Капейку на бара адведкі
Бярог, для забаў маладых.

Чаканы аўтобус нарэшце
Цябе аддае мне як дар.
Цнатлівай усмешкі сашэсце,
Дзявочы даверлівы твар.

Бязмэтна праспектам кіруем –
Той момант шчаслівы злаві,
Дзе радасць спаткання віруе,
Падвышвае ціск у крыві.

Чырвонец, што маю з сабою,
Да ладу тут будзе якраз.
Піўніца нам здасца без бою,
Прытуліць гасцінна на час.

Паўзмрок тытунёвы сустрэне,
Утульнасць жывой гаманы.
І піва, як смагі збавенне,
На вуснах гарчыць без маны.

Нязмушана рупяцца словы –
Так лёгка з табой гаварыць.
Напоўняцца куфлі нанова
Да верху, як мае і быць.

А можа ў «Патсдам» завітаем,
Сустрэч нашых знак-напамін?
Там музыка не замінае
Адчуць цёпладайны камін.
Ці проста на лавачцы ў скверы
Віно п’ём ля ціхай ракі.
Праходзяць міліцыянеры
Наўзбоч непарадак такі.

Бо вечар, спагадлівы знаўца,
Хавае ад лішніх вачэй.
Але не дае разгуляцца,
Падвешвае поўню хутчэй.

Ды ўсё ж не здаёмся адразу,
Цалуемся і пры людзях.
Аўтобус трывае паразу –
Вясёлы праводзінаў шлях.

Бульвар сустракае не ззяннем –
Стамлёна гарацьліхтары.
Няпрошаны міг развітання –
Знікаеш у цёмным двары.

Самога ж чакае пакойчык,
Дзе ўдвух мы жывём з сябруком.
Ён зробіцца сведкам аднойчы,
Як пойдзе будоўля на злом.

# НЕЗАВЕРШАНЫ ПРАЕКТ

Зялёны прыпынак юнацтва,
Спагадлівы наш інстытут.
На пяць на гадоў у сваяцтва
Прыпісаны стала я тут.

Студэнцтва пара залатая,
І горад, і свет зараз твой.
Імклівай хадой пралятае
Той час, дзе заняткі – чаргой.

Як замкі з паветра – паэты,
Як дзеці з пяску – без нуды, –
Так мы на паперы ў праектах
Будуем свае гарады.

Свядома альбо падсвядома
Імкнём ухапіць прыгажосць.
Нікому пакуль невядома,
Дзе шлях твой адметны тут ёсць.

А горад рэальны ахвочы
Падставіць інакшы свой бок.
Спакусай імкнецца сурочыць,
І лёгка той робіцца крок.

Быццё неад'емная частка
Сваволя, віно, кабакі.
Яшчэ не даўмееш дзе пастка,
Жывеш бестурботны такі.

Было б пяць рублёў у кішэні,
Каб з сябрам зайсці ў рэстаран.
На гулі ён шле запрашэнне,
За бляскам хавае падман.

З адною сягоння, а заўтра
З другою балюеш свой рэй.
Няраз, ды і выпадзе карта –
Адчыненых свята дзвярэй.

Сыходзіш з дзяўчынай на вечар,
Ці лепш мо сказаць, што на ноч.
А потым усё недарэчным
Здаецца, бы з'ехаў наўзбоч.

Напраўдзе ж чакаеш кахання,
Адзінага прагнеш душой.
Прадвесцем, што сыдзе адхланне,
Нарэшце сустрэча з табой.

Прыйшла, як таму і належыць,
Яшчэ да знаёмства мая.
З табою прыгожыя вежы
Будуем сабе спакваля.

Дзе горад, дзе мары – не знаю,
Злілося ўсё гэта ў адно.
Як пойдзеш, стаю і чакаю,
Калі загарыцца акно…

Так коцяцца дні чарадою
На свой адмысловы капыл.
Пачуцці змываюць вадою,
Будзённасць наносяць як пыл.
Смак першых сустрэчаў растане,
Салодкасць «Ласунка» спадзе.
А ты зразумець і не ў стане,
Падасца, што наступ ідзе.

На волю тваю, на свабоду,
Якая бяжыць наўздагон.
Чарговую знойдзе прыгоду
Няўмоўкны такі тэлефон.

Няўзнак дзеля жарту спатканні
Прызначыш адразу двам.
Цвярозыя разам пытанні
З пітвом адлятаюць як дым.

Куляецца горкая чарка,
Узмутніцца ўсё ад таго.
З другою цалуюся палка,
Ты ў сябра ў абдымках майго.

Такая вось тут недарэчнасць:
Трызненне, а рады не даць.
Сваімі рукамі бясспрэчнасць
Адкінуў, каб пусткай блукаць.

## ЧАС ПІК

Бадзяюся вольны па свеце,
Забыўся на звабы й праект.
Адбіткі слядоў нашых вецер
З асфальта змяце неўпрыкмет.

Гаркавай салодкая крама
Зрабілася – вер ці не вер.
Між намі нябачная брама –
Ніяк не прайсці напавер.

Ніяк не пазбыцца зацьмення,
Адзін ты, усіх толькі спраў.
Сыходзіць вось так разуменне,
Што я ўжо цябе пакахаў.

Што мне больш не трэба нікога,
Каб толькі адпрэчыць бяду.
Падцісне пад грудзі знямога,
Але я ўсё роўна іду.

Здаецца, што пуста і гола,
Хоць побач людзей а людзей.
Час пік – і не вырвацца з кола,
Жаданай няма анідзе.

Не будзе лёс гэткі няўмольны,
Рахубу сваю падаб’е.
Надарыцца момант спатольны –
Я зноў адшукаю цябе…



# ЗМЕСТ

Вользе ... 5

ШЛЯХ ЛЮБОВІ

Крэда ... 8
Другога не дадзена ... 9
Трыпціх любові ... 10
Папяровыя гарады ... 13
Ветрык арэляў ... 15
Жаночы ранак ... 16
Паратунак ... 17
Жанр ... 18
Памкненне ... 19
*«Пякучае жаданне стаць жанчынай…»* ... 20
Пасля ... 21
Выбар ... 22
Накцюрн ... 23
Знак ... 24
Графіка восені ... 25
*«Восень адлятае – не злавіць…»* ... 26
Шляхцянка-восень ... 27

ПЕРШАПУТАК

Верш пра даўгі ... 30
*«З табой няпроста, цяжка без цябе…»* ... 31
Няпэўнасць ... 32
Верш з эпіграфам ... 33
Зімовае спатканне ... 34
Зімовае развітанне ... 35
Вершы пра каханне ... 36
Малады начны верш ... 37
Паяднанне ... 38
Нечаканы матыў ... 39
Чаканне святла ... 40

У тэатры ........ 41
Нявартая воля ........ 42
Час пік ........ 43
*«Да цябе святлафоры закрылі шляхі…»* ........ 44
Канец студэнцтва ........ 45

ПЯШЧОТНЫ ВЫРАЙ

Паслявясельнае ........ 48
*«Дотык пальцаў тваіх…»* ........ 49
Ноччу ........ 50
Клопат ........ 51
Паўднёвае ........ 52
Ты ........ 53
*«Гайдала свае валасы…»* ........ 54
Песня дажджу ........ 55
Табе ........ 56
Ідылічны матыў ........ 57
На адыходак дня ........ 58
Пяшчотная ноч59
Світальны верш ........ 60
Палянкі дробналесся ........ 62
Прымова ........ 63

АРЭЛІ ДАРОГІ

Сабе і другім ........ 66
*«Ой, вада, – без улады навала…»* ........ 67
Матылёк ........ 68
Кола ........ 69
Начныя гукі ........ 70
Верш пра сябе ........ 71
Тралейбусны сум ........ 72
Два галасы ........ 73
Гадавіна шлюбу ........ 74
Начное імгненне ........ 75
Воз ........ 76
Луг ........ 77
Паўстанак ........ 78
Восеньскі матыў ........ 79

ЦІШЫНЯ

Вянец ........ 82
За гарбатай ........ 83
Сцяжынкі ........ 84
*«Я асуджаны быць маладым...»* ........ 85
*«З майго жыцця не выхапіць радка…»* ........ 86
Плач немаўляці 87
Малодшы сын ........ 88
Дранікі ........ 89
Цішыня ........ 90
У чатыры вочы ........ 91
Канстанта сям'і ........ 92
Каханай ........ 93
Ванны пакой ........ 94
*«Пакінь адзенне, хто сюды ўваходзіць…»* ........ 95

АДВЕЧНАЯ ПЛЫНЬ

Ноч замкнёных дзвярэй ........ 98
Легенда ........ 99
*«Пераменяць лясы – паміраюць і зноў узрастаюць…»* ........ 101
Спас-Еўфрасіння ........ 102
*«Славянскія вочы ў імгле і тумане…»* ........ 103
Расказ аб няздзейсненым кадры ў фільме пра Максіма Багдановіча ........ 104
Шлях майстра ........ 105

ЗНІЧКІ

Згадкі аб першай сустрэчы ........ 108
Зімовыя згадкі ........ 109
*«Ці быў гэты снег, ці яго не было…»* ........ 110
Апошняя ноч ........ 111
Песня ........ 112
Юначы ўспамін ........ 113
Данскі манастыр ........ 114
*«Вельмі хутка накоціцца ноч…»* ........ 115
Цяжкі сон ........ 116
Спагада дарогі ........ 117
Тумановае кола ........ 118

Раз’яднанасць ........ 119
Лірыка кахання ........ 120
Арабінавы дождж ........ 121

САЛОДКА-ГОРКАЯ ПАЭМА
Дзявочы смех ........ 124
Гарачае віно ........ 125
Салодкая крама ........ 128
Незавершаны праект ........ 131
Час пік ........ 134

Літаратурна-мастацкае выданне

**МАРОЗ** Уладзімір Вікенцьевіч

**ШЛЯХЦЯНКА-ВОСЕНЬ**

Лірыка любові й кахання

Мастак М. У. Мароз
Мастацкі рэдактар В. Р. Мішчанка
Набор У. В. Мароз
Вёрстка Зміцера Коласа

Падпісана да друку 22.01.2012. Фармат 84x108 1/32.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 7,35. Ул.-выд. арк. 6,31.
Наклад 550 асобнікаў.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас
ЛИ № 02330/0552654 ад 14.01.2010.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220023, Мінск.